Источник: "Навука" - 2017-11-20

# ВЫТОКІ БЕЛАРУСКАЙ гуманітарыстыкі



**У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа (ЦНБ) адбыўся Міжнародны круглы стол, прысвечаны 95-годдзю Інстытута беларускай культуры.**

Мерапрыемства было арганізавана Інстытутам літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі сумесна з ЦНБ. Заканамерна, што менавіта ўстанова-пераемніца зладзіла ўшанаванне знакавай для беларускай навукі падзеі, паколькі Беларуская Акадэмія навук была створана ў 1928 годзе на базе Інбелкульта. Абмеркаваць лёсы, значэнне, вынікі дзейнасці Інбелкульта сабраліся прадстаўнікі культурных арганізацый, даследчыкі з найбуйнейшых устаноў адукацыі Беларусі.

Працу круглага стала адкрыў дырэктар Інстытута літаратуразнаўства Іван Саверчанка. Ён жа і мадэраваў сустрэчу. З прывітальнымі словамі выступілі акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандр Каваленя, дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Аляксандр Лакотка, а таксама дырэктар ЦНБ Аляксандр Груша.

95-годдзе Інбелкульта стала нагодай звярнуць увагу на сучасны стан беларускай гуманітарнай навукі, яе набыткі і перспектывы. Выступоўцы расказалі пра шэраг мерапрыемстваў вучоных-гуманітарыяў, прысвечаных важным юбілейным датам, якія знамянальна супалі з Годам навукі; падрыхтоўку фундаментальных выданняў, актыўную працу ў рэгіёнах і інш. Вялася гаворка таксама пра актуальныя задачы, сярод якіх – павышаць тыражы акадэмічных выданняў, папулярызуючы тым самым навуковую думку, робячы яе дасяжнай шырокаму колу.



Відавочна, агучаныя на форуме даклады змогуць гэтаму паспрыяць. Так, былі абмеркаваны самыя розныя аспекты дзейнасці Інбелкульта, выказаны крытычныя погляды адносна распаўсюджаных, але памылковых уяўленняў пра гісторыю гэтай установы, удакладнены пэўныя спрэчныя моманты. Удзельнікі закранулі і сумежныя тэмы, актуальныя пытанні гісторыі, літаратуразнаўства, моваазнаўства, этналогіі.

Вялікую ўвагу выклікала выступленне намесніка старшыні Беларускага фонду культуры Тадэвуша Стружэцкага, які агучыў праблемы ў сферы культуры. Выступоўца падкрэсліў, што калі не размаўляць пра праблемы, не абвастраць іх, то яны будуць толькі назапашвацца, але не вырашацца. У прыватнасці, Тадэвуш Іванавіч казаў пра такія негатыўныя з'явы, як зніжэнне выдаткаў на культуру, скарачэнне сеткі дзяржаўных бібліятэк, клубных устаноў, недастатковую камп'ютарызацыю бібліятэк і музеяў і г.д. Усё гэта не спрыяе таму, каб культура станавілася стратэгічным рэсурсам краіны, якім яна, безумоўна, мусіць з'яўляцца.

Міжнародны круглы стол да 95-годдзя Інстытута беларускай культуры стварыў магчымасць прадметнага і зацікаўленага экспертнага абмеркавання, а таму, можна спадзявацца, яго вынікі паспрыяюць далейшым навуковым распрацоўкам, вырашэнню актуальных праблем у гуманітарнай сферы і падрыхтуюць падмурак для таго, каб у будучыні годна адзначыць 100-гадовы юбілей Інбелкульта.

**Алена КАРП,**
**малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы**

Алена Карп. Вытокі беларускай гуманітарыстыкі